Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раена г. Мінска

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 60 г. Мінска”

# ЭКСКУРСІЯ “СЕМ ЦУДАЎ… ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ ШКОЛЫ”

Аўтары:

настаўнік гісторыі катэгорыі настаўнік -метадыст

Хахлова Аксана Георгіеўна,

8 (029 363-69-28);

настаўнік гісторыі вышэйшай категорыі, кіраўнік музея

Крыловіч Людміла Васільеўна,

8 (029 555 91 34)

Змест


| | | |
|---|---|---|
| | Уводзіны | 2 |
| 1. | Асноўная частка | 4-10 |
| 2. | Заключэнне | 10 |

# УВОДЗІНЫ

Ёсць каштоўнасці адвечныя, непадуладныя часу…Іх называюць цудамі свету. Напрыклад, да такіх цудаў адносяцца сусветна вядомыя піраміды, што ў Егіпце. 7 ліпеня 2007 года ў Лісабоне былі абвешчаны “новыя” 7 цудаў свету. У галасаванні па гэтым пытанні прынялі ўдзел дзевяноста мільёнаў чалавек. Сярод новых цудаў свету – Калізей, Тадж-Махал, бразільская статуя Хрыста. Але ААН па пытаннях культуры не падтрымала гэты выбар, бо “далёка не ўсе жыхары планеты маюць доступ да інтэрнэта”. Але заснавальнік конкурсу Бернард Вебер лічыць, што мэта конкурса – напомніць людзям аб культурных каштоўнасцях, якія мы павінны цаніць. Мы таксама вырашылі звярнуць увагу на тое, што не трэба шукаць цуды за сем мораў – яны побач з намі! І вырашылі прапанаваць вам пазнаеміцца с цудамі нашага школьнага гісторыка-краязнаўчага музея.

АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

ЦУД ПЕРШЫ. ПАСВЕДЧАННЕ АБ ЗАКАНЧЭННІ ЦАРКОЎНА-ПРЫХОДСКАЙ ШКОЛЫ 1913Г.




Адзіная сістэма народнай адукацыі была створана ў пачатку 19 стагоддзя. Асновай адукацыі былі гімназіі – у сярэдзіне 19 стагоддзя іх налічвалася сорак на ўсю Расію. Але да 1862 года ў іх не прымалі дзяўчынак. І для дзяцей бедных бацькоў доступ туды быў абмежаваны. Таму большасць людзей у пач. 20 стагоддзя заставаліся неадукаванымі. Таму вялікую ролю ў працэсе адукацыі адыгрывалі царкоўна-прыходскія школы, у якіх навучаліся дзеці сялян і мяшчан. Наша былая вучаніца Вольга Жур падаравала школьнаму музею пасведчанне сваёй сваячніцы Марыі Уладзіміравай, якая 16 чэрвеня 1913 года скончыла Нядзельную царкоўна-прыходскую школу ў Віцебску. Школа належала Віцебскаму Уезднаму Аддзелу Полацкага Епархіальнага Савета. Тут жа ўказаны яе сацыяльны стан – мяшчанка і рэлігійнае веравызначэнне – праваслаўная. І дата яе нараджэнна – 16.01.1902. Падлічыце, колькі ёй было год, калі яна закончыла школу. Пасведчанне ці атэстат вельмі прыгожы, дзяржаўнага ўзору. На пасведчанні – радавод рускіх цароў Раманавых: ад Міхаіла да Мікалая Другога – апошняга цара Расіі. Тут жа змешчаны выявы Маскоўскага Крамля і Іпацьеўскага манастыра. Пасведчанне замацавана пячаткай з двухгаловым арлом-дзяржаўным гербам Расіі.

ЦУД ДРУГІ. ІЛЮСТРАВАНАЯ КНІГА ПА ПРЫРОДАЗНАЎСТВЕ.




А вось вельмі цікавая кніга па ўзнікненні і развіцці жыцця на Зямлі, выдадзеная ў 1848 годзе ў друкарні Вебера ў горадзе Лейпцыгу ў Германіі. Кніга на нямецкай мове, але гэта не перашкода. Дзякуючы вельмі цікавым ілюстрацыям і так усё зразумела. Кніга падзяляецца на тамы і артыкулы. У нас адна кніга, у якой змешчаны 3 і 4 том гэтага захапляльнага твора. Яны прысвечаны рэптыліям і насякомым. Характэрана, што ў кнізе змешчаны не толькі матэрыялы заалагічнага характару, ала і гістарычныя і  нават літаратурна-міфалагічныя даследаванні. Напрыклад, у артыкуле “Гады” паказаны выявы змей-багоў як у Старажытным Егіпце, Рыме і ў Малой Азіі. А вось і міфалагічныя паданні пра гіганцкага гада, які паляваў на людзей і ў вадзе, і на зямлі. Гісторыя з’яўлення гэтай кнігі ў нашым музеі невядома, але яна з’яўляецца сапраўдным цудам для нас. А матэрыялы кнігі актуальныя і вельмі цікавыя нават сёння.



ЦУД ТРЭЦІ. ШТОТЫДНЁВЫ ЧАСОПІС “ОГОНЁК” 1900-1915Г.




“Огонёк” – адзін са старэйшых расійскіх часопісаў. Першы нумар выйшаў у свет 21 снежня 1899 года як штотыднёвы ілюстраваны літаратурна-мастацкі дадатак да газеты “Биржевые ведомости”, якую выдаваў у Пецербурзе вядомы выдавец С. М. Поппер. З часопісам, якому было наканавана на працягу стагоддзя выконваць ролю адзінага штотыднёвіка, з ім супрацоўнічалі лепшыя фатографы, пісьменнікі, рэпарцёры і фельетаністы. З 1902 года “Огонёк” стаў выходзіць самастойна тыражом 120 тысяч экземпляраў у год, саступаючы ў тыражы толькі штомесячнай “Ніве”. У пачатку дваццатага стагоддзя “Огонёк” выходзіў на васьмі старонках. У час кастрычніцкай рэвылюцыі выданне часопіса спынілася. З 20-х гадоў выданне аднавілася, яго выдавецтвам займаўся адзін з лепшых савецкіх журналістаў Міхаіл Кальцоў. У канцы 1923 года тыраж складаў 4 тысячы экземпляраў. Праз год узрос да 125 тысяч. У пасляваенны час выданне часопіса ўзначальвалі Аляксей Суркоў, Анатоль Сафронаў. У гады перабудовы часопіс пад кіраўніцтвам Віталя Кароціча дасягнуў вялікай папулярнасці. Апошняя рэвалюцыя ў “Огоньке” у пачатку 1995 года найбольш наблізіла яго да стандартаў заходніх ілюстраваных выданняў. Але нават новы “Огонёк” застаўся, між іншым, найбольш старым выданнем са старымі традыцыямі.



ЦУД ЧАЦВЁРТЫ. КНІГА “РУССКИЕ ПОЭТЫ 18 ВЕКА” 1943 года выдання.




Гэта вельмі каштоўны  для нас экспанат. Брашура выйшла ў свет, калі ішоў трэці год Вялікай Айчыннай вайны. Гісторыя не ведала яшчэ такіх пакут, якія прыйшлі на захопленую нямецка-фашысцкімі захопнікамі зямлю. Тры чорныя гады невыносна пакутвала Беларусь. Люты вораг быў адкінуты ад Масквы, але яшчэ стаяў пад яе сценамі. Напэўна, з мэтай падняцця баявога духу савецкіх салдат на фронце з’яўляюцца вершы пісьменнікаў-патрыётаў, якія жылі амаль двесце гадоў назад. Сапраўды, паэзія – гэта старая, але вельмі магутная зброя, і 18 стагоддзе выбрана невыпадкова – гэта таксама час вялікіх выпрабаванняў для Расіі, час вялікіх перамог.  Гістарычны вопыт, сабраны ў вершах, гучыць як прароцтва. Вось урывак з верша М. Ламаносава, напісаны ім у час, калі  руская армія граміла быццам  непераможныя войскі нямецкага кайзера Фрыдрыха:

Европа, ныне восхищённа,

Внимая смотрит на восток

И ожидает, изумлена,

Какой определит ей рок…

Германия сему подобно

По собственной крови плывёт

Во время смутно, неспособно,

Конца своих не видит бед.

І нібы прадбачыў перамогу над фашызмам:

И сердце гордого Берлина,

Неистового исполина,

Перуны, близь гремя, трясут.

А верш М. М. Карамзіна “Освобождение Европы” заканчваецца наступнымі радкамі:

…Земли подвиглось основанье!

Он пал! Он пал! Кипят сердца.

К надеждам счастья оживают.

Как дети одного отца,

Все, все друг друга обнимают…

Он пал! В восторге целый свет!

Народы-братья! Злобы нет!

Напэўна, і вершы М. В. Ламаносава, А. П.Сумарокава, Е. І. Кастрова, В. П. Пятрова, Г. Р. Дзяржавіна, М.М. Карамзіна ўнеслі ўклад у перамогу над фашызмам. У 1943 годзе вялікая групоўка нямецкіх войск была акружана пад Сталінградам. Адбыўся карэнны пералом у ходзе Другой Сусветнай вайны на карысць дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. На палях і дарогах вайны сваё жыцці аддалі многія савецкія воіны. Было шмат параненых, многія з якіх абавязаны сваім жыццём медыкам ваенных шпіталяў. Урачы, медсёстры, санітаркі дапамагалі параненым хутчэй залячыць свае раны, паправіць здароўе і хутчэй вярнуцца ў свой полк, роту, да сваіх аднапалчан. Вось і гэта кніга трапіла ў рукі ваеннаму хірургу Карэцкаму Аляксандру Ігнацьевічу ў адным з такіх шпіталяў, дзе параненыя чыталі яе ўслых, дзе яна стала сапраўднай шпітальнай Бібліяй. Ад яго праўнучкі, вучаніцы нашай школы, гэта кніга трапіла да нас у музей. Невядома, ці засталіся яшчэ кнігі з гэтага тыражу, бо ён невялікі – 10 000 экземпляраў. Магчыма, дзякуючы такім патрыятычным выданням, гісторыя не ведала той мужнасці і вытрымкі, якія праявіў савецкі народ у барацьбе з ворагам.

ЦУД ПЯТЫ. ПРАСЫ



Перад намі – гісторыя прасаў. Калі гэты цуд з’явіўся – невядома, аднак першыя звесткі пра прас сустракаюцца ў пісьмовых крыніцах 17 стагоддзя. Раней мокрую тканіну нацягвалі і пакідалі ў такім выглядзе сохнуць. Потым з’яўляецца драўляны валёк для бялізны, затым – пятэльня з вуглём. А з 18



стагоддзя з’яўляюцца розныя канструкцыі прасаў. Але самымі распаўсюджанымі былі духавыя прасы, якія грэлі вуглём. На прасах, якія прадстаўлены ў нас, вы бачыце, як па-рознаму іх аздаблялі рашоткамі, паддувамі: яны нагадваюцуь караблі. А з 19 стагоддзя пад уплывам развіцця тэхнікі адбываецца мадэрнізацыя праса. З’яўляецца прас-жалязка, які награвалі на газавай гарэлцы. Першыя прасы каштавалі вельмі дорага, прыкладна, як карова.

ЦУД ШОСТЫ. РУЧНІК.




Побыт беларусаў немагчыма ўявіць без ручніка. Перад вамі як абрадавыя і дэкаратыўныя ручнікі, так і больш сціплыя па дэкоры, якія прызначаліся для штодзённага побыту і надавалі будзённы выгляд інтэр’еру хаты. Гісторыя беларускага ручніка ведае многа цікавых фактаў. Памеры ручнікоў былі розныя – у нас прадстаўлены ручнікі памерамі ад 25 да 40 см. у шырыню і ад 50 да 1, 5 м. у даўжыню. Найбольш старадаўнія рысы захавалі ручнікі ўсходняй частцы Мінскай вобласці. Ім уласціва шматбардзюрная кампазіцыі з рамбічна-геаметрычным арнаментам на канцах. А вось ручнікі Панямоння (Гродзенскі край) вызначаюцца сваёй колеравай гамай. На іх не ўбачыш палымянага чырвонага колеру, як на ручніках астатніх рэгіёнаў, дзе якраз чырвоны і чорны пераважаюць. Перавага ў каларыстыцы ручнікоў Гродзеншчыны аддаецца натуральным шэра-белым льняным колерам, што можа быць аднесена з дамінуючай у рэгіёне балцкай этнакультурнай традыцыяй. Невыпадкова панямонскія ручнікі стылістычна і тэхналагічна блізкія да суседніх літоўскіх. Узоры на ручніках невыпадковыя –зашыфраваныя. Звярніце ўвагу на ромб, у сярэдзіне якога знаходзяцца кветкі, – гэта сімвал пладароднасці зямлі. А вось на гэтым ручніку шмат ромбаў – сімвалу хлеба.

Ручнік – прадмет, надзелены здольнасцю засцерагаць ад бед і няшчасцяў. Ручнікі вывешвалі і ў царкве, і ў касцёле, на скрыжаванні дарог. Ідучы ў сваты, неслі хлеб у ручніку. Калі сватанне адбылося, маладая перавязвала свата ручніком – быць вяселлю. Словы адной з беларускіх песень: “ А хто мае калечка дастане – той са мной на ручнік стане”.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

## ЦУД СЁМЫ. МЫ ПРАПАНУЕМ ВЫБРАЦЬ ВАМ САМІМ.

Вы неаднаразова наведвалі наш музей, слухалі аглядну экскурсію, наведвалі тэматычныя выставы. Зрабіце свой выбар: які з экспанатаў вы лічаце духоўна-каштоўнасным, магчыма, не для ўсіх – толькі для вас. І не шукайце цуды за сем мораў. Азірніцеся! Яны побач з намі.



*Вучні школы выбіраюць “семы цуд музея”*